Чарговы групавы палёт у космас — новая буйнейшая перамога нашай навукі і тэхнікі. Савецкі народ, усе людзі планеты зараз уключаюць радыёпрыёмнікі, разгортваюць старонкі газет, прыпадаюць да экранаў тэлевізараў, каб пачуць весткі аб палёце касмічных караблёў. Выкладчыкі і студэнты нашага універсітэта ў гэтыя дні выказваюць самыя найлепшыя пажаданні ў адрас лётчыкаў-касманаўтаў і вучоных.



# ГАНАРЫМСЯ, РАДУЕМСЯ, ЧАКАЕМ!

**Ф. Д. ГАХАЎ, прафесар, акадэмік АН БССР:**

— Гэта не што іншае, як шырока планамерны, глыбока прадуманы эксперымент, за якім адкрываецца магчымасць стварэння касмічных арбітальных станцый. Аб такіх станцыях марылі толькі фантасты. Сёння — гэта рэальнасць.

**А. А. ЛАБУДА, выкладчык фізфака:**

— Групавы палёт у космас — гэта новы няўхільны крок савецкіх людзей у касмічныя далі, яшчэ адна вяха ў асваенні міжпланетных трас. Мы ганарымся слаўнымі сынамі-касманаўтамі. Верыцца, што ў хуткім часе будзе пабудавана касмічная станцыя. Жадаем зорным братам шчаслівага прызямлення.

**А. ШЫМАНОВІЧ, студэнт II курса гістфака:**

— Жадаем семярым смелым і мужным паспяхова выканаць заданне Радзімы і шчасліва вярнуцца на родную Зямлю.

**Л. ЦЮКАНІН, студэнт III курса фізфака:**

— Гэтага і трэба было чакаць!

**А. БАРКОВА, студэнтка I курса аддзялення радыёфізікі:**

— Яшчэ раз пераканаліся, што савецкая навука і тэхніка развіваюцца з касмічнай хуткасцю. Марым такімі ж тэмпамі авалодаць ведамі, каб як можна хутчэй пасланць у космас хоць часцінку сваёй працы.

**Т. ЧАРНЯЎСКАЯ, студэнтка I курса журфака:**

— Радуюся! Ганаруся! І хоць мы цяпер па рускай мове вывучаем сінонімы, але ад радасці не магу падабраць слова, каб выказаць пачуцці, выкліканыя новым поспехам савецкай навукі. Увогуле — здорава!


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (757) ● Пятніца, 17 кастрычніка 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII


## ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ЮБІЛЕЮ

З 21 па 25 кастрычніка ў нашым універсітэце будзе праходзіць канферэнцыя маладых вучоных вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Мы папрасілі намесніка старшыні аргкамітэта прафесара Ю. К. ФАМІЧОВА коратка паведаміць аб гэтым цікавым мерапрыемстве.

— Канферэнцыя маладых вучоных вну рэспублікі прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У яе рабоце прымуць удзел прадстаўнікі 14 вышэйшых навучальных устаноў—БДУ, Гомельскага універсітэта, мінскіх політэхнічнага, радыётэхнічнага, тэхналагічнага, медыцынскага інстытутаў, Горацкай сельгасакадэміі, Магілёўскага, Брэсцкага педінстытутаў і іншых.

На канферэнцыі будуць працаваць наступныя секцыі:

матэматычных навук (старшыня прафесар У. П. Платонаў);

хімічных навук (дацэнт М. М. Гарошка);

фізічных навук (прафесар В. Д. Ткачоў);

біялагічных і медыцынскіх навук (прафесар Ю. К. Фамічоў).

Усяго на гэтых секцыях па самых разнастайных пытаннях будзе заслухана каля 250 навуковых паведамленняў. Першыя даклады будуць прачытаны 21 кастрычніка на пленарным пасяджэнні—«У. І. Ленін і пытанні прыродазнаўства» дацэнтам А. Самускевічам і «У. І. Ленін і матэматыка» акадэмікам АН БССР прафесарам Ф. Д. Гахавым.

Хацелася б, каб на гэтай карыснай і цікавай канферэнцыі пабывала як мага больш студэнтаў.

## СУСТРЭЧА З ЖУРНАЛІСТАМІ

Днямі ў актавай зале гуманітарнага корпуса адбылася сустрэча студэнтаў з вядомымі журналістамі, супрацоўнікамі газеты «Известия».

Намеснік дэкана факультэта журналістыкі А. І. Раковіч прадаставіў слова ўласнаму карэспандэнту «Известий» па Беларусі М. Я. Матукоўскаму, які расказаў аб спецыфіцы сваёй работы. Затым выступіў А. А. Аграноўскі. Ён доўга і цікава расказваў аб сваім журналісцкім лёсе, аб паездках па нашай краіне і за яе межы, адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

С. М. Кандрашоў на працягу некалькіх год працаваў уласным карэспандэнтам «Известий» у Егіпце, а пасля ў ЗША. Сваімі ўражаннямі ён таксама падзяліўся са студэнтамі.

Пасля гутаркі прысутныя дзякавалі гасцям і прасілі іх прыязджаць яшчэ.

**А. АЛЯКСАНДРАВА.**

## Госця з Любляны



Па запрашэнню вучонага савета юрыдычнага факультэта ва універсітэце гасціла доктар юрыдычных навук прафесар Люблянскага універсітэта Майда Штробль. Мэтай яе паездкі было азнаямленне з працэсам падрыхтоўкі юрыдычных кадраў у БДУ.

Югаслаўская госця азнаёмілася з культурнымі і гістарычнымі помнікамі Мінска, пабывала ў Хатыні, наведала Курган Славы.

Ва універсітэце паміж Майдай Штробль і нашымі студэнтамі адбыліся карысныя і цікавыя гутаркі. Выступаючы перад студэнтамі трэцяга курса, прафесар з Любляна сказала: «Маё пажаданне як маці, каб вы былі добрымі студэнтамі. Таму што веды, атрыманыя ва універсітэце, будуць вельмі карыснымі ў жыцці. У нас ёсць цудоўная прыказка: «Колькі ведаеш — столькі і важыш».



НА ЗДЫМКУ: прафесар Майда Штробль гутарыць з загадчыкам кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва дацэнтам А. А. Галаўко.

**В. ЕЛІСЕЕНКА.**
Фота **М. Басава.**

*НА ЗДЫМКУ ЎНІЗЕ: студэнты з Балгарыі ў час азнаямленча-вытворчай практыкі на хімічным факультэце нашага універсітэта.*

Фота **М. Нечыпарэнкі.**



## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

● Партыйны сход хімічнага факультэта заслухаў справаздачу аб рабоце партыйнага бюро за мінулы навучальны год. Выбран новы склад бюро. Разгледжан шэраг іншых пытанняў.

● 14 кастрычніка адбылася VII прафсаюзная канферэнцыя матфака. Была заслухана справаздача прафбюро і спортбюро. Удзельнікі канферэнцыі выбралі дэлегатаў на прафканферэнцыю універсітэта.

● У гэты ж дзень студэнты юрыдычнага факультэта правялі справаздачна-выбарны камсамольскі сход.

● У канцы мінулага тыдня на юрыдычным факультэце прайшоў справаздачна-выбарны прафсаюзны сход. Старшыня прафбюро В. Сілівончык у сваім дакладзе асаблівую ўвагу сканцэнтраваў на недастатковай узаемасувязі ў рабоце прафсаюзнай, партыйнай і камсамольскай арганізацый.

У спрэчках па дакладу выступілі студэнты В. Мялежка, А. Смірноў, А. Бяржанін і іншыя. У заключэнне выступіў сакратар партбюро С. Г. Драбязка.

Універсітэцкі тыдзень

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ СТУДСАВЕТ

У інтэрнаце па в. Бабруйскай нядаўна адбыўся сход студэнтаў, на якім са справаздачай выступіў старшыня студсавета студэнт пятага курса фізфака Анатоль Кулеш.

Пасля абмеркавання даклада сход прыняў рашэнне аб мерах па паляпшэнню быту студэнтаў, санітарнага стану памяшканняў, разгортванню культурна-масавай работы ў інтэрнаце.

Некалькімі днямі раней на сходзе зямляцтва в'етнамскія студэнты, што жывуць у гэтым інтэрнаце, вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад гэтага студсавета. Адбылося сумеснае арганізацыйнае пасяджэнне. Старшыней інтэрнацыянальнага студсавета інтэрната, у якім жыве звыш 310 савецкіх і в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат, выбран студэнт трэцяга курса фізфака Валянцін Серга. Яго намеснікам аднагалосна выбран студэнт падрыхтоўчага факультэта в'етнамец Нгуен Конг Лыу.

На пасяджэнні былі размеркаваны абавязкі паміж членамі студсавета, распрацаван і зацверджан план работы, умовы агляду-конкурсу на лепшы пакой у інтэрнаце.

**В. СЯРГЕЕЎ.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПАВЫШАЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ЗА ДАРУЧАНУЮ СПРАВУ

Партыйная арганізацыя факультэта журналістыкі пакуль што невялікая. Яна налічвае ў сваіх радах 43 камуністы. Але іх адметны ўплыў адчуваецца ва ўсім вучэбна-выхаваўчым працэсе. Так на факультэце павялося, што на кожным партыйным сходзе ў цесным коле камуністаў заўсёды размова заходзіць аб надзённым, аб тым, як выправіць недахопы ў рабоце.

Так было і на справаздачна-выбарным партыйным сходзе факультэта журналістыкі, што адбыўся днямі. Камуністы падвялі вынікі работы за 1968-69 навучальны год.

Са справаздачай выступіў сакратар партбюро факультэта А. Г. Слука. Ён адзначыў, што ўся работа партыйнай арганізацыі была накіравана на дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Дзякуючы намаганням партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый факультэт журналістыкі дасягнуў значных поспехаў у паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу. У зімовую сесію факультэт заняў другое месца ва універсітэце па паспяховасці, былі паказаны параўнаўча добрыя вынікі і ў час здачы экзаменаў у другім семестры. Меў факультэт поспехі ў спартыўнай рабоце. Заняў другое месца на агульнауніверсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці, які прайшоў вясной 1969 года. Сіламі студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыка фотасправы Г. З. Бегуна было аформлена некалькі стэндаў, прысвечаных 50-годдзю БССР і КПБ, друку, нашым выпускнікам, лепшым студэнтам і т. д.

Партыйная арганізацыя імкнулася не толькі унікаць у вучэбна-выхаваўчы працэс на факультэце, а і ва ўсё жыццё. Удзялялася пэўная ўвага навукова-даследчай рабоце, якая значна ажывілася ў апошні час. За 1968-69 навучальны год члены кафедры факультэта журналістыкі выдалі некалькі зборнікаў навуковых артыкулаў, выступалі ў «Весніку БДУ». Выдалі новыя даследаванні Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, Е. Л. Бондарава і Л. Ф. Шылава. Рыхтуюць доктарскія дысертацыі Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, М. С. Зярніцкі, падрыхтавалі кандыдацкія дысертацыі А. А. Плаўнік, І. І. Сачанка.

На сходзе па-дзелавому, сур'ёзна і прынцыпова гаварылі камуністы аб тых задачах, якія стаяць перад факультэтам. Праз усе выступленні чырвонай ніткай праходзіла адна думка — большая актывізацыя работы кожнага камуніста, больш патрабаванняў да сябе і акружаючых, індывідуальная работа ў групах. Выступіўшыя ў спрэчках камуністы М. С. Зярніцкі, А. І. Ракові́ч, М. Я. Цікоцкі, М. М. Дрозд, У. Ф. Маляўскі прапанавалі яшчэ больш узняць ролю дэканата, партыйнага бюро, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый у наладжванні ўсёй работы на факультэце, павысіць адказнасць камуністаў за стан работы, вучобы і выхавання студэнтаў.

Студэнтка чацвёртага курса Святлана Сас пажадала новаму складу партыйнага бюро звяртаць больш увагі на выхаванне ў студэнтаў-журналістаў этычных паводзін.

Ёсць усе падставы меркаваць, што новы склад партыйнага бюро, якое ўзначаліў М. Е. Дастанка, у знамянальны для нашай краіны час — 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна — актывізуе работу факультэцкіх арганізацый, накіруе намаганні калектыву факультэта на дастойную сустрэчу слаўнага юбілею, даб'ецца павышэння авангарднай ролі камуністаў на ўсіх участках вучэбна-выхаваўчага працэсу і навукова-даследчай работы.

С. ГОВІН,
выкладчык журфака.



*НА ЗДЫМКУ: студэнтка II курса Л. МАРОЗАВА выконвае лабараторнае заданне па хіміі.*

# ПА СТУПЕНЬКАХ НАВУКІ

**Хто з сённяшніх студэнтаў не марыць аб навуковых адкрыццях, карысных знаходках, якія ператвараюць здагадкі ў непарушныя ісціны! Але вядома, што лесвіца навукі даволі крутая, і не кожны адважваецца стаць нават на яе першую прыступку — узяцца за работу ў студэнцкім навуковым гуртку. А менавіта тут юнакі і дзяўчаты, акрамя шырокага авалодання ведамі, набываюць здольнасць настойліва і карпатліва працаваць над выбранай тэмай, што наогул неабходна кожнаму студэнту.**

**Сёння нам хочацца расказаць аб студэнцкім навуковым таварыстве філалагічнага факультэта. І дапаможа нам зрабіць гэта навуковы кіраўнік таварыства прафесар Л. І. Фіглоўская.**

**— Усяго на факультэце існуе дзесяць гурткоў, вельмі цікавых і разнастайных па тэматыцы сваёй работы. Так, зацікаўленыя сучаснай беларускай мовай (кіраўнік гуртка Е. М. Камароўская) займаюцца вывучэннем беларускай, рускай, польскай лексікі і праблемамі, якія датычаць культуры мовы.**

**Галоўная тэма, над якой працуе гурток беларускага літаратуразнаўства і крытыкі (кіраўнік В. П. Рагойша), — вывучэнне літаратурнай дзейнасці пісьменнікаў, крытыкаў, вучоных, былых студэнтаў або супрацоўнікаў БДУ. Тэма гэта будзе распрацоўвацца да 1971 года, юбілейнага для нашага універсітэта.**

**Калектыў фалькларыстаў, якім кіруюць прафесар М. А. Жыдовіч і дацэнт І. М. Шчарбакова, зараз карпатліва апрацоўваюць матэрыялы, сабраныя ў выніку нядаўніх экспедыцый. Класіфікаваць больш пяці тысяч слоў, запісаных у дваццаці пяці населеных пунктах, — якая напружаная і, здаецца, марудная праца! Аднак перамагае тут не толькі настойлівасць, але і любоў да сваёй справы, да роднай мовы.**

**Безумоўна, такія даследаванні прыносяць пэўную карысць, і яны не застаюцца па-за ўвагай. На рэспубліканскім аглядзе шэсць студэнцкіх навуковых работ былі адзначаны першымі катэгорыямі, а студэнткі чацвёртага курса Л. Брыгадзіна і Р. Мацвеева дакладвалі аб выніках сваёй працы на Ленінградскай канферэнцыі вну.**

**Цяпер удзельнікі СНТ зноў рыхтуюцца да новага рэспубліканскага агляду. Вядучая тэма большасці з гэтых работ — ленінская. Гэтай тэматыцы прысвечан і зборнік «Дзеля жыцця на зямлі», які рыхтуецца да выдання на кафедры беларускай літаратуры.**

**Планы, жаданні, мары... Іх вельмі шмат ва ўдзельнікаў СНТ. Іх здзяйсненне патрабуе нялёгкай працы, настойлівасці і вялікай зацікаўленасці навукай.**

**У заключэнне мы звяртаемся да тых, хто хоча паспрабаваць свае сілы ў навуковых даследаваннях: «Калі ласка! Навуковыя студэнцкія гурткі чакаюць вас!»**

**Г. НАУМЧЫК,**
**Н. САЛУК.**




# Адказы Н.К.Крупскай на анкету Інстытута мозгу

СЛАБЫМ не быў, але не быў і асабліва дужым. Фізічнай працай не займаўся. Хіба толькі на суботніку. Яшчэ памятаю: адрамантаваў агароджу, калі былі ў ссылцы. На прагулках не вельмі хутка стамляўся. Быў рухавы. Аддаваў перавагу хадзьбе. Дома пастаянна хадзіў па пакоі, хутка з вугла ў вугал, часам на цыпачках «з вугла ў вугал». Абдумваў што-небудзь. Чаму на цыпачках? Думаю, што часткова, каб не турбаваць, у тым ліку ў эміграцыі, калі наймалі пакой, каб не турбаваць і гаспадароў кватэры. Але гэта толькі часткова.

Акрамя таго, напэўна, яшчэ і таму, што такой хуткай бясшумнай хадзьбой на цыпачках стваралася яшчэ большая засяроджанасць.

Ляжаць безумоўна не любіў.

Скаванасці ў рухах не было. Рухі не мяккія, але яны не былі і рэзкімі, вуглаватымі.

Хадзіў хутка. Пры хадзьбе не пакачваўся і рукамі асабліва не размахваў.

Нязграбны не быў, хутчэй спрытны.

Бязладнасці і мітуслівасці ў рухах не было.

На нагах быў вельмі цвёрды.

Гімнастыкай не займаўся. Іграў у гарадкі. Плаваў, добра катаўся на каньках, любіў катацца на веласіпедзе. У ссылцы катаўся на каньках па рацэ, уздоўж берага. На Волзе месцы не грыбныя, дзе ён жыў. Калі я прыехала да яго ў ссылку, мы часта хадзілі ў лес па грыбы. Вочы ў яго былі добрыя, і калі ён (хутка) навучыўся шукаць і знаходзіць грыбы, дык шукаў з азартам. Быў азартны грыбнік. Любіў паляванне з ружжом. Страшна любіў хадзіць па лесе ўвогуле.

Майстэрствам і рамяством не займаўся, калі не лічыць пісьма «хіміяй».

Апранаўся і распранаўся хутка. У час хваробы ён стараўся не адступаць ад адной і той жа працэдуры, іменна для таго, каб зрабіць усё хутка.

Улюбёныя жэсты і прывычныя рухі — рухі правай рукой у час прамовы наперад і ўправа. Нядаўна бачыла вобраз Ільіча з правай рукой (у час прамовы): прадплеччам наперад, але плячо прыціснута да тулава — гэта няправільна, так ён не рабіў, — рука ішла наперад, выцягвалася або закругленым рухам і адыходзіла ад тулава.

Такіх жэстаў, як біццё кулаком па стале або паграджанне пальцам, ніколі не было.

Манернасці, вычурнасці, дзіўнасцей, тэатральнасці, рысавання ў рухах не было.

Міміка і жэстыкуляцыя заўсёды былі выразныя. Сталі пэўна больш жывымі ў час хваробы. Усміхаўся вельмі часта. Усмешка добрая, яхідная і «ветлівай» яна не была.

Ух, як умеў хахатаць. Да слёз. Адкідваўся назад пры хохаце.

Ні так званай ветлівай усмешкі або смеху, нацягнутасці. Яны былі заўсёды велымі натуральныя.

Голас быў гучны, але не крыклівы, грудны. Барытон. Спяваў. Рэпертуар: «Нас венчали не в церкви», «Я вас люблю, люблю безмерно», «Замучен тяжелой неволей», «Варшавянка», «Вставай, подымайся, рабочий народ», «Смело, товарищи, в ногу», «День настал веселый мая», «Беснуйтесь, тираны», «Vous avez pris Elsass et Lorraine», «Soldats de dix-septieme».

Гаварыў хутка. Стэнаграфісты дрэнна запісвалі. Можа, зрэшты, і не таму, што хутка, а таму, што 1) стэнаграфісты у нас былі тады дрэнныя і 2) канструкцыя фраз у яго была цяжкая.

У зборніку «Леф» ёсць артыкул, у якім аўтары, разбіраючы структуру прамовы Ільіча, прыходзяць да вываду, што канструкцыя мовы (фраз) лацінская.

Ільіч мне неяк гаварыў, што ён у свой час вельмі захапляўся лацінскай мовай.

Голас выразны, не манатонны. Асабліва выразнымі і ў адносінах мадуляцыі былі яго Zwischenruf'е. Я іх як цяпер чую.

Мова простая была, не вычурная і не тэатральная, не было ні «натуральнай штучнасці», «пявучая» тыпу французскай мовы (як у Луначарскага, напрыклад), не было і сухасці, дзеравянасці, манатоннасці тыпу англійскай — руская мова пасярэдзіне паміж гэтымі крайнасцямі. І яна была ў Ільіча такая — пасярэдзіне — тыповая руская мова. Яна была эмацыянальна насычаная, але не тэатральная, не надуманая; натуральна эмацыянальная. Мадуляванні не былі штампавана аднастайнымі і стэрэатыпнымі.

Плаўная і свабодная![1] Словы і фразы падбіраў свабодна, не адчуваючы цяжкасцей. Праўда, ён заўсёды вельмі старанна рыхтаваўся да выступленняў, але, рыхтуючыся, ён рыхтаваў не фразы, а план прамовы, абдумваў змест, думкі абдумваў.

Гаварыў заўсёды з захапленнем — ці было гэта выступленне або гутарка — ён вельмі змацыянальным быў, — рыхтуючыся да выступлення, ходзіць па пакоі і шэптам гаворыць артыкул, напрыклад, які рыхтуецца напісаць. На прагулцы, бывала, ідзе маўкліва, засяроджана. Тады я таксама не гавару, даю яму ўвайсці ў сябе. Затым пачынаў гаварыць падрабязна, грунтоўна і вельмі не любіў устаўных пытанняў. Пасля спрэчак, дыскусій, калі вярталіся дамоў, быў часта змрочны, маўклівы, расхваляваны. Я ніколі не распытвала — ён сам заўсёды пасля расказваў, без пытанняў.

На прагулках часта бывалі выпадкі, калі якая-небудзь нечаканая рэпліка паказвала, што, гуляючы, ён сканцэнтравана і напружана думаў, абдумваў і г. д.

«Лезе на маляўнічую гару, а думае зусім не аб гары, а пра меншавікоў» (гл. успаміны Эсен (Звер).

У гэтым жа і бяда была ў час пачатку хваробы. Калі ўрачы забаранілі чытанне і ўвогуле работу. Думаю, што гэта няправільна было. Ільіч часта гаварыў мне: «Яны ж (і я сам) не могуць забараніць мне думаць».

Патрэба выказацца, высвятліць у яго была заўсёды вельмі выражана. Здарэнняў выпадання з памяці слоў, фраз і зваротаў або неразумення сэнсу і значэння слоў субяседніка не было. Наадварот, незвычайна хутка ўлаўліваў сэнс і значэнне. Яго запісы — часта адным словам, адной фразай.

Дома, калі якое-небудзь пытанне яго моцна хвалявала, заўсёды гаварыў шапатком.

Велымі бадзёры, настойлівы і вытрыманы чалавек быў. Аптыміст.

У турме быў — сама вытрымка і бадзёрасць. У час хваробы быў выпадак, калі ў прысутнасці медсястры я яму гаварыла, што вось, маўляў, мова, ведаеш, аднаўляецца, толькі марудна. Глядзі на гэта, як на часовае знаходжанне ў турме. Медсястра гаворыць: «Ну, якая ж турма, што Вы гаворыце, Надзежда Канстанцінаўна?».

Ільіч зразумеў: пасля гэтай размовы ён стаў пэўна больш сябе трымаць у руках.

Любіў напяваць і насвістваць.

Пісаў вельмі хутка, са скарачэннямі. Пісаў з незвычайнай хуткасцю, многа і ахвотна. Да дакладаў заўсёды запісваў думку і план прамовы. Запісваў на дакладах думкі і прамовы дакладчыка і прамоўцаў. У гэтых запісах заўсёды ўсё асноўнае было схоплена, ніколі не прапушчана.

Почырк станавіўся больш выразным, калі пісаў што-небудзь (у пісьмах, напрыклад), што яго асабліва цікавіла і хвалявала.

Пісьмо было звязнае і лагічна паслядоўнае. Скарачэнні літар (галосных часта) і складоў практыкаваў вельмі часта, з мэтай паскарэння пісьма.

Рукапісы пісаў заўсёды адразу начыста. Памарак вельмі мала.



*НА ЗДЫМКУ: студэнты юрыдычнага факультэта займаюцца ў кабінеце тэорыі дзяржавы і права. Фота Я. БРОЛІШСА.*

# ВУЧЫЦЦА ЦІКАВА!

На юрфаку, як і на іншых факультэтах, ідуць напружаныя дні вучобы. Асабліва нялёгка першакурснікам: у зімовую сесію ім давядзецца вытрымаць экзамены, каб быць сапраўднымі студэнтамі.

Наперадзе залікі па «двух кітах», як гавораць яны, — па гісторыі дзяржавы і права зарубежных краін і гісторыі дзяржавы і права СССР. Рубеж нялёгкі. Першакурснікі гэта адчуваюць і таму як мага больш часу стараюцца правесці над кнігай. Уважліва слухаюць лекцыі. На адной з іх мы якраз і пабывалі. Загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права дацэнт Васіль Аляксандравіч Дарогін расказваў студэнтам аб сутнасці, тыпах і формах дзяржавы. З вялікай увагай і зацікаўленасцю слухалі студэнты гэтую лекцыю.

У перапынку мы задалі ім некалькі пытанняў:

— **Які прадмет вам больш за ўсё падабаецца?**

**Людміла Пратасава:** Для мяне тут усё новае, усё цікавае. Больш за ўсё падабаюцца лекцыі па курсу тэорыі дзяржавы і права.

— **У вас, здаецца, былі ўжо семінарскія заняткі. Як прайшлі яны?**

**Галя Бенчук:** Так, былі, па тэорыі дзяржавы і права, гісторыі дзяржавы і права СССР, палітэканоміі. Да іх мы добра падрыхтаваліся. Грунтоўныя веды пры адказах на пытанні выявілі Анатоль Раеўскі, Уладзімір Гусеў, Анатоль Плігаўка і многія іншыя.

На першым курсе займаецца студэнт з Судана Самір Шахін.

— **Ці цяжка займацца на юрфаку?** — з такім пытаннем звярнуліся мы да яго.

— Увогуле нялёгка. Пакуль што не паспяваю весці канспекты, таму даводзіцца многа сядзець у чытальнай зале. З лекцый асабліва цікавіць мяне гісторыя дзяржавы і права замежных краін.

— **Ці добрыя рабяты ў вашай групе?**

— Група цудоўная. Вельмі цікава і весела.

Справы ў першакурснікаў ідуць нядрэнна. Цяпер самае галоўнае для іх — узяць патрэбны разбег, поўнасцю акунуцца ў вучобу, актыўна ўключыцца ў грамадскую работу.

**Т. АЛЯКСЕЕВА,**
**В. РАДКЕВІЧ,**
**нашы карэспандэнты.**

СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

# СЛІЗГАНУЛІ ПА ПАВЕРХНІ

**У панядзелак у актавай зале галоўнага корпуса праходзіў камсамольскі справаздачна - выбарны сход гістарычнага факультэта. Адкрываючы яго, сакратар камітэта камсамола гістфака Таня Глушакова сказала:**

**— Хацелася б, каб гэты сход стаў падзеяй для першакурснікаў. Падзеяй таму, што гэта першы камсамольскі сход у іх універсітэцкім жыцці. І мы павінны паказаць нашым малодшым таварышам, што ўяўляе сабой наша арганізацыя, у чым яе заслугі, у чым няўдачы — ім працягваць добрае, выкараняць дрэннае.**

**Ці ўдаўся гэты добры намер?**

**Справаздачны даклад, прачытаны сакратаром камітэта камсамола Т. Глушаковай, слухаць увогуле было цікава. Прыводзілася многа лічбаў, пераканаўчых фактаў аб добрых справах студэнтаў універсітэта. Зімой гісторыкі і філосафы працавалі на заводах Мінска, аддаючы зробленыя грошы ў фонд помніка студэнтам і выкладчыкам, якія загінулі ў гады Айчыннай вайны. Летам у г. Тальяці будаўнічы атрад гісторыкаў заняў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве. У вольны ад работы час студэнты выступалі з лекцыямі і канцэртамі ў цэхах і на будаўнічых пляцоўках.**

**Гаварылася і аб недахопах. Напрыклад, слаба вядзецца індывідуальная работа з кожным са студэнтаў. Мала патрабавальнасці прад'яўляе камітэт камсамола да парушальнікаў дысцыпліны і двоечнікаў. Але глыбокага, дэталёвага аналізу камсамольскай работы ў дакладзе па сутнасці не было.**

**Пасля аб дзейнасці групы народнага кантролю далажыў У. Санько. В. Мядзянік расказаў аб спартыўным жыцці факультэта. Выступіў таксама дэкан факультэта П. З. Савачкін і іншыя. Але выступалі толькі тыя, хто быў запісаны. Астатнія моўчкі слухалі. Балючым месцам сходу зноў аказалася слабая актыўнасць камсамольцаў.**

**Быў момант, калі, здавалася, можа завязацца сур'ёзная і адкрытая размова. Гэта калі Т. Глушакова загаварыла аб павышэнні патрабавальнасці камсамольскай групы да кожнага свайго члена, аб тым, што пара расквітацца з лібералізмам. Варта было толькі падтрымаць, не даць затухнуць іскры... Не, не падтрымалі.**

**Уручэнне падарункаў — такая цырымонія, якая прыемна і для тых, хто атрымлівае падарункі, і проста для гледачоў: прыемна ж паганарыцца за таварыша. Называліся прозвішчы лепшых байцоў будаўнічых атрадаў. Уручаліся граматы Мінскага абкома камсамола, гаркома камсамола, камітэта камсамола універсітэта. Паднесены былі падарункі.**

**Нарэшце, важнейшая частка сходу — выбары новага складу камітэта камсамола, выбары народных кантралёраў і дэлегатаў на універсітэцкую камсамольскую канферэнцыю. Гэтая частка сходу праходзіла нібы пад лозунгам: «Абы хутчэй!» Маланкава пералічаліся прозвішчы. Галасавалі адразу за ўсіх. Абсалютна нічога не гаварылася аб тых, каго выбіралі. Хто яны, чым вызначаюцца сярод таварышаў, іх становучыя рысы—для першакурснікаў засталося невядомым.**

**А цяпер вы самі можаце адказаць на пастаўленае ў пачатку пытанне: «Ці ўдаўся гэты добры намер?»**

**А. КУХАРЧУК,**
**наш спецкар.**

# Навіны СНТ

**На біяфаку выйшаў першы ў сёлетнім навучальным годзе бюлетэнь студэнцкага навуковага таварыства.**

**Асноўную ўвагу прыкоўвае матэрыял дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, у якім падводзяцца вынікі абароны дыпломных работ за 1969 год. Тут адзначаецца, што некаторыя рэцэнзенты і кіраўнікі дыпломных работ беспадстаўна перабольшваюць вартасць студэнцкай працы. Так, напрыклад, справаздачу выпускніцы Л. Гузавай навуковы кіраўнік М. І. Габрыловіч і рэцэнзент В. С. Палупанаў ацанілі вышэйшым балам. Калі ж дыпломную работу разгледзела ДЭК, дык аказалася, што яна заслугоўвае не вышэй здавальняючай адзнакі.**

**Не менш цікавымі ў навуковым бюлетэні з'яўляюцца артыкулы дацэнта кафедры беспазваночных жывёл Н. П. Ляховіч, выпускніцы біяфака Н. Сварчковай, кіраўніка практыкай студэнтаў-біяфізікаў, дацэнта кафедры біяхіміі і біяфізікі К. М. Даўгалевіча. Апошні дзеліцца вопытам правядзення вытворчай практыкі. Пры гэтым ён адзначае, што практыка пры напісанні дыпломных работ аказвае студэнтам самую непасрэдную дапамогу.**

**У бюлетэні СНТ змешчаны біяграфічныя звесткі аб выдатных вучоных-біёлагах.**

**У. ЯДРАНЦАЎ.**

**У першы том юбілейнага выдання «Воспоминаний о В. И. Ленине» ўпершыню поўнасцю ўключаны адказы Надзежды Канстанцінаўны Крупскай на анкету Інстытута мозгу.**

**Вучоныя, занятыя спецыяльнымі даследаваннямі, вывучалі асобу Леніна ў яе шматвобразных праяўленнях, тое, як яна ўспрымалася сучаснікамі, саратнікамі, блізкімі сябрамі. Натуральна, што асаблівае значэнне мелі адказы Н. К. Крупскай на анкету. Ніхто не мог даць такіх дакладных звестак аб характары, тэмпераменце, схільнасцях, густах, сімпатыях, звычках Леніна.**

**Пытанні, якія задавалі вучоныя Надзеждзе Канстанцінаўне, на жаль, не захаваліся.**

**Асобныя адказы Н. К. Крупскай у свой час былі надрукаваны ў «Литературной газете» і «Известиях». Сёння мы публікуем поўны тэкст адказаў Крупскай на анкету Інстытута мозгу.**

Перавагі вуснага ці пісьмовага выказвання не было. Па-мойму, і тое, і другое былі вельмі моцна развіты. Лёгка і свабодна і пісаў, і гаварыў.

Статыстычныя табліцы, лічбы, выпіскі пісаў заўсёды незвычайна выразна, з асаблівай стараннасцю, — гэта «ўзоры каліграфіі». Выпісваў іх ахвотна, заўсёды і лічбамі, і крывымі, і дыяграмамі, але ніколі не дыяграмамі выяўленчымі (у выглядзе малюнкаў).

Статыстычную графіку выкарыстоўваў шырока, чарціў сам, і вельмі дакладна.

Ніяк і ніколі нічога не маляваў.

Чытаў незвычайна хутка. Чытаў пра сябе. Услых ні я яму, ні ён мне ніколі нічога не чыталі, у завадзе гэтага ў нас не было: гэта ж намнога замаруджвае.

Шэптам пры чытанні часам гаварыў, што думаў у сувязі з чытаннем.

Удалечыню бачыў добра. Яны з мамай (маёй) часта спаборнічалі ў гэтай справе.

Вокамер у яго быў добры — страляў добра і ў гарадкі гуляў нядрэнна.

Колеры і адценні адрозніваў вельмі добра і правільна.

Зрокавая памяць цудоўная. Твары, старонкі, радкі запамінаў вельмі добра. Добра ўтрымліваў у памяці і надоўга бачанае і падрабязнасці бачанага.

Здзіўляюча любіў прыроду. Любіў горы, лес і захады сонца. Вельмі цаніў і любіў спалучэнні фарбаў. На сваё адзенне звяртаў увагі мала. Думаю, што колер яго гальштука быў для яго абыякавы. Ды і да гальштука адносіўся як да нязручнай неабходнасці.

Добра чуў на абодва вухі. Добра чуў шэптавую мову. Арыентаваўся ў незнаёмай мясцовасці добра. Адлегласці і напрамкі па слыху таксама вызначаў добра.

Вельмі добра запамінаў і вельмі добра ўтрымліваў у памяці пачутае. Перадаваў усё дакладна, упэўнена і свабодна. Думаю, што зрокавая і слыхавая памяць у яго былі прыблізна роўныя па ступені развіцця.

У час падрыхтоўкі да выступленняў і ўвогуле займаючыся любіў падкрэсліванні, пометкі, выпіскі і канспекты і ўжываў іх часта і многа. Яны часта былі кароткія і выразныя. Але ў час чытання шапаткам гаварыў толькі з прычыны прачытанага. Шапаткам гаварыў свой артыкул. Слухаць, як іншы чытае, — гэта ў нас не было ў завадзе.

Вельмі любіў слухаць расказ. Слухаў сур'ёзна, уважліва, ахвотна. Ёсць успаміны групы рабочых, якія наведалі яго пасля хваробы. Яны пішуць, што Ільіч гаварыў з імі. У сапраўднасці ён толькі слухаў.

Ён любіў слухаць музыку. Але страшна стамляўся пры гэтым. Слухаў сур'ёзна. Вельмі любіў Вагнера. Як правіла, уходзіў пасля першага дзеяння, як хворы.

Шуму ўвогуле не любіў (я гавару не аб шуме люднай вуліцы, натоўпу, вялікага горада). Але вось у кватэры не любіў шуму.

Музыкальны. Музыкальная памяць добрая. Запамінаў добра, але не тое, каб вельмі хутка. Больш усяго любіў скрыпку. Любіў піяніна. Абсалютны слых? Не ведаю. Наконт акорда таксама не ведаю. Рытм? Ноты? Ці мог чытаць іх? Не ведаю.

Оперу любіў больш за балет.

Любіў санаты «Патэтычную» і «Апасіянату».

Любіў песню тарэадора. Ахвотна хадзіў у Парыжы ў канцэрты. Але ўсяго гэтага было мала ў нашым жыцці. Тэатр ён любіў — заўсёды гэта аказвала на яго глыбокае ўражанне. У Швейцарыі мы хадзілі з ім на «Жывы труп».

Вышыні не баяўся — у гарах хадзіў «па самым краі». Хуткую язду любіў.

Пад размову пісаць не мог (не любіў), патрэбна была цішыня абсалютная.

Даволі пакорна еў усё, што дадуць. Некаторы час елі кожны дзень каніну. Яны з Інакенціем[2] знаходзілі, што вельмі смачна.

У маладосці і ў турме мучыўся катарам страўніка і кішак. Часта, памятаю, пытаў, перайшоўшы на дамашні стол, які выправіў гэтыя катары: «А мне можна гэта есці?» Перац і гарчыцу любіў. Не мог есці суніц (ідыясінкразія).

З асалодай еў прастаквашу. Смак і нюх увогуле былі слаба развіты. Пахі ён адрозніваў, канешне, але ніякай прыхільнасці і да іх увогуле, і да асобных не было.

У пакоі не выносіў садовых кветак. Але любіў у пакоі палявыя кветкі і зелень. Вельмі любіў вясеннія пахі. Садовых кветак, і асабліва з моцным пахам, пазбягаў.

Памятаю, я яго застала за такім заняткам: падліваў у 1922 годзе цёплую ваду ў збанок, у якім мы паставілі галінкі з набухлымі почкамі (вясной справа адбывалася).

Аптыміст. У Сібіры і ў Францыі ён быў увогуле больш нервовым. Мучыўся страшнай бяссонніцай. Раніцы заўсёды ў яго былі дрэнныя, позна засынаў і дрэнна спаў. У Швейцарыі вельмі памагла размеранасць швейцарскага жыцця, а ў Францыі мы жылі шыварат-навыварат. Познія гутаркі і спрэчкі да ночы (у Сібіры і за граніцай). У Сібіры аднаго часу перад канцом ссылкі страшна хваляваўся, што могуць прадоўжыць, — быў тады асабліва нервовы і зласлівы. Нават пахудзеў.

Меланхоліі, апатыі не бывала. Змены настрою заўсёды ўвогуле мелі яўную прычыну і былі адэкватны. Вельмі нервавала яго склока замежная, сваркі і спрэчкі з Пляханавым і з уперадаўцамі.

Увогуле вельмі эмацыянальны. Усе перажыванні былі эмацыянальныя.

Звычайны, пераважны настрой — напружаная сканцэнтраванасць.

Вясёлы і жартаўлівы.

Частай змены настрою не было. Увогуле ўсе змены заўсёды былі абгрунтаваныя.

Вельмі добра валодаў сабой.

Калі гаварыў, калі па тых ці іншых прычынах не трэба было стрымлівацца, заўсёды востра ставіў пытанні, завастраў іх, «не зважаючы на асобы».

У гутарках з людзьмі, якіх выхоўваў, быў вельмі тактычны.

Уражлівы. Рэагаваў вельмі моцна.

У Бруселі пасля сутычкі з Пляханавым зараз жа сеў пісаць ядавітыя заўвагі на ядавітыя заўвагі Пляханава, нягледзячы на ўгаворы пайсці гуляць: «Пайшлі сабор глядзець».

Бляднеў, калі хваляваўся.

Страснасць захопліваючая мовы, яна адчувалася нават, калі гаварыў знешне спакойна.

Перад усякім выступленнем вельмі хваляваўся: засяроджаны, не гаваркі, ухіляўся ад размовы на іншыя тэмы, па твары відаць, што хвалюецца, прадумвае. Абавязкова пісаў план прамовы.

Вельмі моцна было выражана імкненне паглыблена, па-даследніцку падыходзіць да пытанняў.

У Шушы, напрыклад, селянін 2 гадзіны расказваў яму, як ён пасварыўся са сваімі за тое, што не пачаставалі яго на вяселлі. Ільіч распытваў незвычайна ўважліва, стараючыся пазнаёміцца з бытам і жыццём.

Заўсёды арганічная нейкая сувязь з жыццём.

Каласальная сканцэнтраванасць.

Самакрытычны, вельмі строга адносіўся да сябе. Але капанне і пакутлівейшы самааналіз у душы ненавідзеў.

Калі вельмі хваляваўся, браў слоўнік (напрыклад, Макарава) і мог гадзінамі яго чытаць.

Быў баявы чалавек.

Адарацкаму па дэталях расказваў, як будзе выглядаць сацыялістычная рэвалюцыя.

Азарт на паляванні — поўзанне за качкамі на чацвярэньках. Непатрэбнага рыску — дзеля рыску — няма. У ваду кідаўся першы. Ні пужлівасці, ні баязлівасці.

Смелы і адважны.

---

**[1] Маецца на ўвазе гутарка У. І. Леніна. — Рэд.**

**[2] Інакенцій — І. Ф. Дубровінскі. — Рэд.**

Студэнты падрыхтоўчага факультэта, як толькі прыязджаюць з далёкага В'етнама на вучобу ў наш універсітэт, у першую чаргу знаёмяцца з горадам Мінскам. Яны наведваюць яго шматлікія прадпрыемствы, знаёмяцца з культурнымі і гістарычнымі помнікамі.

НА ЗДЫМКУ: студэнты падрыхтоўчага факультэта ля Дома-музея I з'езда РСДРП.

Фота М. Нечыпарэнкі.




# СЛОВЫ, ЗВЕРНУТЫЯ ДА НАС

## *Карысна прачытаць*

«Зайздросны лёс чалавека — сваё разуменне мастацтва, сваё майстэрства, любоў умець перадаць іншым». Гэтыя словы старэйшына савецкага мастацтва Сяргей Цімафеевіч Канянкоў адрасуе мастаку К. Ф. Юону. Але іх у поўнай меры можна аднесці і да самога Сяргея Цімафеевіча.

Часам шматслоўныя біяграфіі і тым больш лаканічныя аўтабіяграфіі не могуць сказаць пра чалавека таго, што раскрывае невялікі эпізод успамінаў. І гэта набліжае да нас аўтара, ён становіцца больш зразумелым, з ім хочацца сустрэцца зноў, убачыць у яго творах тое, што раней заставалася непрыкметным і таямнічым. Такое ўражанне, думаю, застанецца ў кожнага, хто прачытае кнігу С. Ц. Канянкова «Зямля і людзі» (выдавецтва ЦК ВЛКСМ «Маладая гвардыя». 1968 г.).

У кнізе сабраны розныя нарысы, і ў той жа час усе яны арганічна звязаны адзін з другім. Аб'ядноўвае іх адно — вялікая, шчырая любоў да цудоўнага набытку чалавецтва — мастацтва і літаратуры.

Нарысам «Тытан Адраджэння» аўтар як бы пачынае незвычайны вернісаж, вобразна паказваючы нам галерэю партрэтаў. Пераступім і мы парог гэтай выстаўкі.

Здзіўляе почырк мастака, незвычайнае бачанне свету, навізна яго ўспрымання.

Мікеланджэла. Гэтае імя вядома ўсім і даўно, але нарыс «Тытан Адраджэння» — усё ж сапраўднае адкрыццё. Час не ўладны над мастацтвам, якое прысвяціла сябе збавенню людзей ад гора і пакут, піша Сяргей Цімафеевіч. Такім з'яўляецца мастацтва Мікеланджэла. Аўтар нарыса як бы лепіць партрэт гэтага незвычайнага чалавека. «Талент Мікеланджэла быў падобны на казачны джын, які вырваўся з вузкай гарлавіны бутэлькі. Не было сілы, здольнай суняць, увесці ў жаданае рэчышча гэты неўтаймоўны тэмперамент, гэты ўсеабдымны геній...»

Нарыс-партрэт «Радэн і яго час» пераносіць нас у Францыю. «Рыцарам без страху і папроку, які выйшаў на арэну жыцця рабіць подзвігі ў імя святога мастацтва, уяўляецца мне сёння Радэн», — піша Канянкоў. Далей аўтар знаёміць нас з Бурдзелем, Майолем. У кнізе — партрэты не толькі замежных майстроў. С. Ц. Канянкоў з непадкупнай шчырасцю, душэўнай цеплынёй успамінае рускіх жывапісцаў і скульптараў.

Перад намі В. І. Сурыкаў. «Полымя душы» — так назван нарыс пра яго. Гэты мастак займаў важнае месца ў жыцці маладога Канянкова. «Выказванні Сурыкава аб мастацтве служылі для мяне, як і для іншых маладых мастакоў, своеасаблівай энцыклапедыяй, адкуль мы чэрпалі веды вельмі карысныя».

Далей у галерэі канянкоўскіх партрэтаў — Ганна Сямёнаўна Галубкіна, «цудоўны скульптар, палымяная рэвалюцыянерка». Па просьбе маскоўскіх бальшавікоў яна першая са скульптараў Расіі вылепіла бюст Карла Маркса. Працуючы над партрэтам Талстога, Галубкіна арыентавалася на ленінскую характарыстыку пісьменніка. І ў выніку «Талстой у яе партрэце — сапраўды «глыба», з пранізлівым поглядам, умудроны і цікавы ў сваёй кожнай рысе. Але разгарнуць усю моц сваіх творчых сіл Галубкінай не ўдалося: перашкаджала цяжкая хвароба. Зробленае ёю — вялікае захапленне. «Мастацтву, роднаму рускаму народу аддала свой незвычайны талент Ганна Сямёнаўна Галубкіна. Яе жыццё — прыклад для сучасных савецкіх мастакоў... Яе жыццё — маральны ўзор», — падкрэслівае Канянкоў-пісьменнік.

У нарысе «Лёс мастака» мы знаёмімся са своеасаблівым, але паўзабытым рускім жывапісцам Мікалаем Іванавічам Фешыным. У гэтага чалавека, па словах С. Канянкова, быццам сакаліны позірк і прыроднае каларытнае пачуццё. Валодаў ён фарбамі беспамылкова, свабодна, шырока. Малюнак у яго настолькі дакладны, што майстэрства не заўважаеш.

У кнізе прыведзены словы прызнання мастака, які апынуўся пасля рэвалюцыі за мяжой: «Бессэнсоўнае жыццё чалавека на чужыне. Людзі мастацтва не павінны пакідаць сваю краіну!.. У чужой краіне існуеш, а жывеш — успамінамі...»

А вось расказ пра другога чалавека, які таксама выехаў на чужыну, — Ф. І. Шаляпіна. «Здзіўляючых здольнасцей чалавек быў народжаны рускай зямлёй!— піша С. Канянкоў. — Свабода ўвасаблення, з якой Шаляпін разгарнуў перад усім светам свой талент, захапляла мяне, натхняла ў рабоце над партрэтам артыста. Я паказаў яго з самкнутымі вуснамі, але ўсім яго аблічам хацеў перадаць песню. Вось-вось яна сарвецца з вуснаў... Песню і музыку немагчыма вылепіць у поўным сэнсе гэтага слова. Але ў белакаменнай глыбе мармура — свая музыка. Яе трэба выявіць і ажывіць... Ён быў мне дарагім і блізкім, як спявак, што адкрыў неабмежаваную ўладу музыкі над чалавекам. Ён быў народжаны вялікім народам і адкрыў свету тытанічную душэўную сілу савецкага чалавека...»

І пра людзей паэзіі знайшоў што сказаць шчодрай душы чалавек — Сяргей Цімафеевіч Канянкоў. Ён ставіць побач двух вялікіх рускіх паэтаў — Ясеніна і Маякоўскага. І не толькі па таленту, але і таму, што яны засталіся «вернымі ўзвышанай ідэі Леніна і праславілі ў сваіх творах прыход новай эры, пранікнёна паказаўшы кроўную сувязь рэвалюцыі і народа».

Вобраз яшчэ аднаго паэта сустракаецца на старонках кнігі. Гэта Пушкін — «нябачны субяседнік». Яму належыць асаблівая любоў аўтара.

Галерэю партрэтаў працягваюць Горкі, мастакі Корын і Юон, графік Фаворскі. Спынімся толькі на нарысе «Ленін».

Сяргей Цімафеевіч належыць да ліку тых ужо нямногіх людзей, каму пашчаслівілася бачыць і гутарыць з Уладзімірам Ільічом Леніным. «Мне давялося сустрэцца з Уладзімірам Ільічом. Гэта незабыўна. Нельга бясцэнны вопыт сувязі з Леніным лічыць толькі сваім набыткам. Мы павінны перадаць пакаленню, якое ідзе за намі, эстафету ленінскіх думак, спраў і ўчынкаў.

Першая сустрэча з Леніным захапіла мяне і як мастака, асабліва яго вялікі і адкрыты лоб, акружаны злёгку пакручастымі валасамі залатога адцення...».

Былі і іншыя сустрэчы, звязаныя са здзяйсненнем ленінскага плана манументальнай прапаганды. І заўсёды маладога тады мастака здзіўлялі ўвага і клопаты Леніна аб мастацтве. «У маім жыцці мастака Ленін пакінуў глыбокую баразну да канца дзён маіх, — прызнаецца Сяргей Цімафеевіч.—Я зразумеў, праўда, не адразу (так часта бывае з людзьмі), як гэта важна вызначыць правільна, наколькі твая творчасць служыць народу, як важна, каб кожны чалавек знаходзіў у тваім творы водгук сваіх думак і пачуццяў».

Радок за радком праходзіць перад намі роздум умудронага жыццём чалавека. Кніга адрасавана маладым, ім і жадае Канянкоў «усе сілы свайго растучага сэрца, усё сваё хваляванне, усе клопаты аддаваць за шчасце на зямлі для ўсіх».

Прачытана апошняя старонка кнігі. І доўга яшчэ гучаць словы, звернутыя да ўсіх нас: не абкрадваць сябе, не абядняць; змагацца за свой кругагляд, за глыбіню ведаў; выхоўваць у сабе вышэйшую чалавечнасць, жыць так, каб кожны дзень здаваўся новым. «Прыгожае жыццё з разгорнутымі крылямі».

Н. КОНДРУСЕВА.

# *ПРЫВІТАННЕ, КНІГА!*

Галоўны корпус. Другі паверх. Універсітэцкая бібліятэка. Тут жа — аб'ява: «Выстаўка кніжных навінак. Па аўторках з 12 да 19 гадзін».

Мне пашанцавала. Быў якраз аўторак. Праз сцяну, утвораную студэнтамі, прабіўся да столікаў ля акна, дзе зіхацелі новымі вокладкамі кнігі. Ветлівая маладая жанчына расказвала аб кніжных навінках, адказвала на шматлікія пытанні наведвальнікаў.

Знаёмімся. Гэта — Валянціна Сяргееўна МАЛАШЭНКА, супрацоўнік бібліятэкі.

**— Валянціна Сяргееўна, гледзячы на такую колькасць студэнтаў, бачна, што выстаўка карыстаецца вялікім поспехам.**

— Гэта зразумела: хутка пасля рэгістрацыі гэтыя кнігі будуць стаяць на кніжных паліцах бібліятэкі. А хто хоча прапусціць цікавую рэч!

**— Ці даўно праводзяцца такія выстаўкі?**

— Першая была арганізавана тры гады назад. І варта адзначыць, што з кожнай выстаўкай экспазіцыя ўзрастае. Цяпер, напрыклад, экспануецца 300 выданняў.

**— Цікава, якія кнігі карыстаюцца найбольшым попытам?**

— Адказаць цяжка. У нас ёсць многа цікавых выданняў. Сярод іх кнігі па матэматыцы, хіміі, фізіцы, па самых разнастайных галінах навукі, культуры, мастацтва. Увагу студэнтаў прыцягваюць навукова-фантастычныя творы.

З прыродазнаўчых кніг выклікаюць цікавасць «Естественно - квантовая электроника», «Химическая связь в кристаллах», «Роль микроорганизмов в питании растений и плодородии почвы» і іншыя.

**— Мы набліжаемся да вялікай даты — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Якія творы па ленінскай тэматыцы паступаюць у бібліятэку?**

— Такіх кніг даволі многа. Яны расказваюць аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці Ільіча ў Расіі і за мяжой, многія з іх прысвечаны ўспамінам яго саратнікаў. Наогул, ленінская літаратура займае значнае месца на нашай выстаўцы.

Добра было б, каб нашу выстаўку студэнты наведвалі як можна часцей.

**В. ЯЦЭВІЧ, студкор.**



ЗАЧАРАВАННЕ... Фотаэцюд А. Ласмінскага.

# АДКУЛЬ ПАЙШЛО?

**Бальзаковский возраст.**

Выражение возникло после выхода романа французского писателя Оноре Бальзака (1799—1850) «Тридцатилетняя женщина» (1831); употребляется как шутливая характеристика женщин в возрасте 30—40 лет. В этом же значении отсюда возникли выражения: «Бальзаковская женщина», «Бальзаковская героиня».

**Беда, коль пироги начнет печи сапожник,**
**А сапоги тачать пирожник.**

Цитата из басни И. А. Крылова «Щука и кот» (1813).

**Беден, как Ир.**

Выражение возникло из «Одиссеи» Гомера, в которой рассказывается о нищем по имени Ир.

# *МІМА-ХОДАМ*

**...У Дэльтфскім універсітэце ў Нідэрландах з'явілася першая ў свеце аўтаматычная бібліятэка. Дастаткова набраць адпаведны нумар кнігі на адным з шасці тэлефонаў, устаноўленых у зале каталагаў, і менш чым праз паўмінуты кніга паступае ў распараджэнне чытача. Як толькі нумар набран, светавы сігнал на паверхах, дзе захоўваюцца кнігі, дае знаць работнікам бібліятэкі аб месцазнаходжанні патрэбнага тома. Неабходная кніга апускаецца да чытача па спецыяльнаму латку. Калі ж кнігі няма на месцы, у залу каталогаў перадаецца сігнал. Дзякуючы гэтай новай сістэме тэрмін чакання кнігі скараціўся з сарака мінут да 16 секунд.**

* * *

**...Французскі раманіст Рэфіт дэ ля Брэтон (1734—1806), будучы выдатным наборшчыкам-друкаром, з двухсот трох сваіх раманаў, многія з якіх, дарэчы, папулярныя па сённяшні дзень, сто пяцьдзесят два напісаў і набраў непасрэдна ў друкарні.**

* * *

**...У Нацыянальным музеі Турцыі захоўваецца самае вялікае пергаментнае пісьмо. Яго паслаў у шаснаццатым веку персідскі шах султану Аманскай імперыі. Даўжыня гэтага паслання — дзесяць метраў, шырыня — сем.**

* * *

**...Дырэктар друкарні Будапешцкага універсітэта Юліуш Янка калекцыяніруе міні-кнігі. Самую маленькую з іх можна загарнуць у паштовую марку! Размер яе — усяго пяць на пяць міліметраў.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 17282 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1674. Тыраж 2000 экз.